УДК 303.422.4

Івашкевіч К. П., Мяцельскі А. А.

# АСНОЎНЫ ЗАКОН МАРАЛІ НА ПРАЦЯГУ СТАГОДДЗЯЎ У “ЖЫЦІІ ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ”

*Навуковы кіраўнік: Мяцельскі А. А., ст. выкладчык*
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**

У артыкуле разглядаюцца асноўныя догмы маралі ў жыційнай літаратуры на прыкладзе “Жыція Ефрасінні Полацкай”. Актуальнасць даследавання абумоўлена зацікаўленасцю чалавека да маральнасці, духоўнасці, чысціні думак і пачуццяў, бо самым актуальным для сённяшняга дня з’яўляецца пытанне пра духоўнае адраджэнне нацыі, а менавіта маральнасць – гэта аснова для духоўнага адраджэння.

**Ключавыя словы:** мараль, маральнасць, гуманізм, Ефрасіння Полацкая, “Жыціе Ефрасінні Полацкай”, духоўнае адраджэнне нацыі

Ivaskivich K. P., Miatselski A. A.

# THE BASIC LAW OF MORALITY FOR CENTURIES IN "THE LIFE OF EUPHROSYNE OF POLOTSK”

*Sientific Supervisor: Miatselski A. A., Senior Lecturer*
*Belarusian National Technical University*
*Minsk, Republic of Belarus*

**Abstract**

The article examines the main dogmas of morality in life literature using the example of "Life of Efrasinna Polotskaya". The relevance of the research is determined by the human interest in morality, spirituality, purity of thoughts and feelings, because the most relevant issue for today

is the spiritual revival of the nation, namely, morality is the basis for spiritual revival.
**Keywords:** morality, morality, humanism, Efrasinna Polatskaya, "Life of Efrasinna Polatskaya", spiritual revival of the nation

У наш бурны час, калі кожны дзень нясе трагічныя весткі, калі ў многіх з нас няма ўпэўненасці ў заўтра, ці актуальна гаварыць пра духоўнасць, маральнасць? Многія палічаць разважанні на гэту тэму недарэчнымі, але нам думаецца, што гэта не так. На наш погляд, самым актуальным для сённяшняга дня з’яўляецца пытанне пра духоўнае адраджэнне нацыі, бо толькі маральнасць – гэта аснова для духоўнага адраджэння.

Пакуль заганы ў душах будуць нормай, пакуль сквапнасць, эгаізм, жорсткасць, непрыняцце кожнага чалавека як роднага будуць успрымацца як пустыя словы, адмоўны стан жыцця будзе ўзмацняцца, і ніякія дасягненні нашай цывілізацыі не вырашаць гэтыя праблемы.

Для існавання высокацывілізаванага грамадства ва ўсе часы неабходна прытрымлівацца канонаў маральнасці і гуманізму. Пра гэта мы знаходзім сведчанне ў творах мастацкай літаратуры са старажытных часоў і да сённяшняга моманту. Для чалавека, які ўпершыню знаёміцца з творамі старажытнай літаратуры, яны падаюцца ў многім загадкавымі. Сярэднявечны твор уяўляецца таямнічым светам за зачыненымі дзвярыма. І гэта не дзіўна. Нам цяжка ўявіць лад жыцця, спосаб мыслення далёкага продка, а між тым, чалавек Сярэднявечча і сапраўды глядзеў на свет інакш, чым мы.

Як вядома, унутраны свет старажытнага чалавека з яго верай у міфалогію прадвызначыў сабою канцэптуальнасць і арсенал вобразнасці антычнай літаратуры, унутраны ж свет сярэднявечнага чалавека з яго верай у Бога быў першай абумовай пафасу, сюжэтаў, герояў, настрояў у сярэднявечнай літаратуры. Чалавек Сярэднявечча, будучы творцам культуры новай эпохі, з'яўляўся пачынальнікам і яе адкрывальнікам. Новы ў сваім часе, ён ствараў і новую літаратуру, якую мы сёння называем сярэднявечнай. Менавіта новая для свайго часу літаратура, як любое адкрыццё, была аптымістычная, зарыентаваная на ідэал прыгожага, добрага, вечнага.

Само па сабе веданне нормаў маралі не з’яўляецца паказчыкам маральнасці. Што значыць – “паводзіць сябе духоўна”? Паводзіны чалавека выражаюць яго адносіны да іншых людзей, грамадства і самога сябе. Цэнтральным элементам маральных паводзін з’яўляецца ўчынак, якому папярэднічае матыў, пастаноўка мэт, прыняцце рашэння. Ацэньванне ўчынка адбываецца не толькі па выніках, але і па матывах, якія кіруюць дзеяннямі чалавека. Маральная ацэнка дапускае асуджэнне ці адабрэнне ўчынка, паводзіны чалавека на аснове законаў маралі. “Залатое правіла маральнасці” ў адносінах да іншых людзей патрабуе ад чалавека кіравацца такімі нормамі, якія прыдатныя для ўсіх людзей і выражаюць агульнае патрабаванне чалавечнасці: “Не жадай іншым таго, чаго не хочаш, каб жадалі табе” або “Паступай так, як ты хочаш, каб паступалі іншыя ў адносінах да цябе”.

Ефрасіння Полацкая… Без гэтага імя немагчыма ўявіць не толькі панараму ўсходнеславянскіх зямель у XII стагоддзі, але і ўсю шматвяковую гісторыю Беларусі. Пра яе жыццё і дабрачыннасць распавядае толькі адзін твор: "Жыціе і смерць святой і блажэннай і найпадобнейшай Ефрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў горадзе Полацку". Гэты агіяграфічны твор, часам перанасычаны "біяграфічнымі гіпотэзамі", значна большую ўвагу надае перадачы ўнутранага стану персанажа пры поўнай упэўненасці, што чалавек павінен быў паводзіць сябе толькі належным чынам.

Ефрасіння Полацкая – “небопарный орел, попарившия от Запада и до въстока, яко луча солнечьнаа, просветившия всю землю Полотькую” [1]. Князёўна, ігуменння, выдатная асветніца, пра якую “Жыціе Еўфрасінні Полацкай” кажа, што яна, святая Еўфрасіння , пакінула па сабе вечную памяць у душы народа.

Ужо ў юнацтве яна сама перапісвала і перакладала кнігі. Пазней, як стала ігуменняй, адкрыла пры пабудаваных яе стараннем Багародзіцкім і Спасаўскім манастырах так званыя скрыпторыі – майстэрні па перапісванні кніг. З яе імем звязваюць полацкае летапісанне і збіранне бібліятэкі Сафійскага сабора, заснаванне манастырскіх школ.

Трэба адзначыць, што манастыры ў XI-XII ст.ст. на землях Беларусі адыгрывалі важную ролю ў збіранні інтэлектуальнага патэнцыялу грамадства. Яны з'ўляліся цэнтрамі духоўнага жыцця.

Тут падзвіжнікі спасцігалі навуку, набывалі мастацкі густ, а галоўнае, вучыліся хрысціянскай дабрачыннасці. Маладыя таленавітыя людзі маглі раскрыць свае здольнасці літаратара, мастака, кампазітара. Манахі не парывалі духоўных сувязяў са знешнім светам, а шчодра дзяліліся з насельніцтвам набытымі ў манастыры ведамі. Ефрасіння, каб служыць свайму народу, самааддана ўключылася ў вучэбны працэс і яшчэ больш рупліваю стала, "збіраючы дабрачынныя думкі ў сэрцы сваім, як пчала мёд у соты".

Маштаб дзейнасці, духоўныя і грамадскія інтарэсы Ефрасінні Полацкай прасціраліся далёка за межы манастырскай келлі. Падзвіжніца ўздымала свой голас супраць княжацкіх міжусобіц. Этыкай хрысціянскага гуманізму, ачышчальнай сілай кніжнага слова, узнесёных храмаў і святога крыжа яднала свой народ і Полацкую дзяржаву княжацкая дачка і славутая асветніца. “Нікога бо не хацела бачыць варожым: ні кназя з князем, ні баярына з баярынам, ні слугі са слугою, але ўсіх хацела бачыць як адзіную душу”, – сведчыць прысвечанае ёй “Жыціе…”.

Пры гэтым асноўную ўвагу аўтар надае подзвігу духоўнага ўзвышэння гераіні, раскрыццю характару і багатага ўнутранага свету падзвіжніцы, яе высокіх маральных і духоўных якасцей. Прыкладам свайго жыцця і паводзін Ефрасіння імкнецца сцвердзіць новую для ўсходніх славян хрысціянскую этыку і жыццёвую філасофію, якая зыходзіць з перавагі духу над целам, бескарыснага дабра над злом, сэнсоўнага і сціплага духоўнага жыцця над раскошай багатага, але марнага існавання. “ А з маёмасці ўсяе, – перадае яе словы невядомы аўтар, – ёсць у мяне адно гэтыя кнігі, з якіх мае ўцеху душа і ўзвесяляецца сэрца” .

Цікава, што суровая прастата яе маральнай пропаведзі, з якой яна звяртаецца да паслушніц, поруч з хрысціянскімі запаведзямі ўключае нормы народнай этыкі і маралі: ”Старыя учаше терпению и въздержанию, уныя же учаше душевней чистоте и безтрастию телесному, говеянию образну, ступатию кротку, гласу смиренну, слову благочинну, ядению и питью безмолвъну, при старейшей молчати, мудрейших послушати, к старейшим покорение, к точьным и меньшим любовь без лицемериа, мало вещати, а множае разумети” [1].

“…начат подвижнейши подвиг постнический восприимати. И начат книги писати своима рукама, и наем емлющи требующим даяше” [1].

Вучні і насельнікі манастыроў атрымлівалі ад ігуменні Ефрасінні выдатныя ўрокі красамоўства: “Се собрах вы, яко кокош птенца под креле свои, и в паствину, яко овца, да пасетеся в заповедех Божиих. Да и аз веселым сердцем подвизаюся учити вам уением. А нивы ваша во едину меру стоят, не растуще ни поступающе горе, а год приспевает во свершение, и лопата на гумне лежит. Но боюся, егда будет плевел в васи предани будете огню негасимому. Потщитеся, чада моя, убежати сих всех и сотворитеся пшеница чиста, и смелитися в жрънових смирением и молитвами и постом, да хлеб чист принесетесяна трапезу Христову” [1].

Сцверджанню полацкай асветніцы як нябеснай апякункі Бацькаўшчыны спрыяла нацыянальнае адраджэнне пачатку XX стагоддзя. Газета “Крывічанін” у 1918 годзе пісала: “Ня ўсім ведама, што патронкай Беларусі з'яўляецца сьв. Еўфрасіньня-Прадслава княжна Полацкая, ігуменя манастыра сьв. Спаса…”.

Еўфрасіння Полацкая – асветніца, маці-апякунка, прапаведніца, шчырая заступніца ўсіх пакрыўджаных, убогіх, абяздоленых.

Прайшло тысячагоддзе… Кожны з нас мае цэлы шэраг якасцей, якія характарызуюць нас як людзей. Хтосьці больш добры, шчыры, справядлівы. Нехта злы, злобны, гнеўны. Але мы ўсе людзі. Менавіта нашы пачуцці ствараюць з нас людзей, характарызуюць нас як асобу. І каб адпавядаць высокаму званню “Чалавек”, неабходна мець у сваім арсенале такія якасці душы, як міласэрнасць і спачуванне. Менавіта гэтыя рысы ў адносінах да іншых людзей робяць нас чалавечнымі. Бясспрэчна, толькі мастацтва, пабуджальнай сілай якога з’яўляюцца гуманныя ідэалы, здольна ўзбагачаць чалавецтва маральнымі і эстэтычнымі каштоўнасцямі. Нам, сучаснай моладзі, хочацца адзначыць, што дабрыня, міласэрнасць і спачуванне да бліжняга – самыя каштоўныя рысы чалавека з вялікай літары.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Житие Евфросинии Полоцкой [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.krotov.info/acts/12/3/evfrosinia_polozk.htm. – Дата доступу: 28.03.2023.

2. Мельников, А. Преподобная Евфросиния Полоцкая / А. Мельников. – Минск: Изд-во “Четыре четверти”. – 1997. – 121 с.